# 500 гадоў еўрапейскай традыцыі ў Гародні

*Крыніца друкавання*: Мілінкевіч, А. 500 гадоў еўрапейскай традыцыі ў Гародні / Аляксандр Мілінкевіч // Гродзенская праўда. – 1996. – 4 ліпеня. – С. 3.

Сёлета старажытная Гародня святкуе знамянальную дату сваёй гісторыі — 500 гадавіну надання гораду поўнага Магдэбургскага права. Гэта падзея яшчэ раз нагадвае аб тым, што ў сярэднявеччы наша Бацькаўшчына развівалася ў рэчышчы еўрапейскай традыцыі, якая мела на гэтай зямлі не толькі сваё адлюстраванне, але набывала тут свае непаўторныя рысы.

Чым жа было для нашых продкаў гэтае, як тады часцей за ўсё казалі, “майдэборгскае права"? Гісторыя яго пачынаецца яшчэ ў XIII стагоддзі ў горадзе Магдэбургу, што ва Усходняй Германіі. Менавіта там упершыню гараджане дамагліся вызвалення ад феадальных павіннасцей, атрымалі гарантыі на свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам, змаглі выбіраць свой орган улады — магістрат, суд, ствараць рамесныя аб’яднанні — цэхі.

Першыя граматы на няпоўнае Магдэбургскае права на нашай зямлі атрымалі Бярэсце і Гародня ў канцы XIV стагоддзя. На працягу некалькіх вякоў яно шырока распаўсюдзілася на нашай зямлі, і больш за 50 беларускіх гарадоў і мястэчак дабіліся такіх прывілеяў. Мы часта ўзгадваем славутую нашу талерантнасць, законапаслухмянасць, цярпімасць, але гэтыя рысы не зышлі з неба, яны выхоўваліся ў беларускага народа на працягу вякоў, у тым ліку законамі, што абуджалі ў людзях грамадскую пазіцыю, гонар і павагу да іншых. Нельга не адзначыць з удзячнасцю гаспадароў нашай дзяржавы, пачынаючы з Вітаўта і Ягайлы і канчаючы Станіславам Аўгустам, якія адмаўляліся ад асабістых правоў і неадкладнага ўзбагачэння дзеля дабрабыту і росквіту гарадоў, грамадскага ладу, што ў рэшце рэшт умацоўвала ўладу і спрыяла аўтарытэту манарха.

На Беларусі Магдэбургскае права ўвабрала ў сябе старадаўнія мясцовыя традыцыі народнага веча, вядомыя яшчэ з 12 стагоддзя ў Полацку, і было больш дэмакратычным, чым у Заходняй Еўропе: не перадавалася ў спадчыну пасада судовых лаўнікаў (прысяжных), яны выбіраліся гарадской радай з адабрэння сходу гараджан, з дапамогай камісіі “паспалітых”

ажыццяўляўся кантроль за ўладай.

Аднак вернемся да Гародні. Яна змагалася за свае правы і незалежнасць цэлае стагоддзе: упершыню прывілей падпісаў кароль Ягайла ў 1391 годзе, затым ягоны сын Казімір пашырыў правы гараджан у 1444 годзе, і ўрэшце ўнук Ягалы Аляксандр у 1496 годзе абвясціў, што горад пераходзіць на поўнае самакіраванне.

Апошні дакумент захаваўся. Напісаны ён узнёслаю моваю і выдатна перадае настрой вялікага князя і матывацыю гэтага акта. "Прывілей Найяснейшага Аляксандра князя Літоўскага ў Берштах Года Панскага 1496 Дня Св. Бенядыкта дадзены. Права Майдэборгскае з уфундаваннем Войтаўства, Млын Нёманскі, звальненне ад падаткаў па рацэ Нёман гандлюючым... Кірмашы Гродзенскія, Суды Земскія.., Усіх правоў лібертацыя ў імя Панскае Амэн..." "Лістам гэтым замацоўваюцца і пазначэннем сведкаў дапатопных часоў вечнасці ў памяці хай будзе пададзена “воля Аляксандра" з Божай ласкі Вялікага князя Літоўскага, Рускага, Жамойцкага...”



Самакіраванне павінна было служыць справам грамадскім, паляпшэнню добраўпарадкавання горада і “каб людзі, што ў ім жывуць, парадкам добрым і справядлівым у сваіх уладараннях сталі багацейшымі". Князь дазваляў пабудаваць тры карчмы, вольныя ад усіх падаткаў, вольны млын на Нёмане, а таксама вызваляў ад пошліны на Нёмане аж да Прусіі. Гродзенцы станавіліся фактычна свабоднымі людзьмі, што маглі самі абіраць гарадскую раду і бургамістра, вызваляліся яны і ад замкавых павіннасцей, акрамя адной, што заўсёды выконвалі жыхары Падолу — суправаджэнне князя ў час палявання. Прывілей дазваляў "для пажытку войтаўскага пабудаваць баню”, а таксама "нават Ратушу на гаднейшым месцы’’ з усімі ўласцівымі ёй атрыбутамі, з мерай збожжа —“ратушнай бочкай” і мерай мёду — "медніцай". Магістрат мог прадаваць зямлю пад новабудоўлі ў пашыраных месцах, бо пад юрысдыкцыю Магдэбургскага права пераходзілі Падаляне і Занёманцы. Князь Аляксандр выказваў надзею, што "грамадзяне Гародні кожны паасобку і ўсе разам" павінны "цешыцца і

весяліцца”, бо гэта дазволіць узбагаціцца нашаму гораду па прыкладу іншых ужо вольных.

Паводле тагачасных традыцый горад у якасці сімвалаў самакіравання атрымліваў герб, пячатку з яго выявай і сцяг. Такім чынам, гродзенскаму гербу з выявай аленя Св. Губерта таксама паўтысяча гадоў. Ёсць пэўная лагічная сувязь паміж месцамі падпісання прывілея – вёскай Берштаы Лідскага павету (сёння Шчучынскі раён) і патронам Гародні. Але спачатку нагадаем легенду святога. Вядома аб ім няшмат. Жыў ён у канцы VII — пачатку VIII стагоддзяў, калі хрысціянская царква была яшчэ адзінай і з'яўляўся біскупам горада Льежа, што ў Бельгіі. Губерт быў чалавекам добразычлівым, папулярным і любімым сярод вернікаў. Што праўда, меў адну слабасць—быў заўзятым паляўнічым... Аднойчы ў час чарговага палявання ён трапіў на цудоўнай прыгажосці аленя. Але ў момант, калі Губерт прыцэліўся са свайго арбалету, яго асляпіла незвычайнае ззянне: паміж рагоў аленя ў промнях сонца з'явіўся залаты крыж. Святы не стэліў… Пад уражаннем Боскага паслання біскуп адмаўляецца ад паляванняў і аддае ўсе свае сілы і значныя сродкі на абарону жывёлін. Па сутнасці ён быў першым вядомым нам эколагам на Старым кантыненце і ўвайшоў у еўрапейскую гісторыю як патрон паляўнічых і прыроды.



*Гродненская гарадская пячатка 1540 года (копія Ул.Кіслага)*

Сёння можа здавацца дзіўным, што вялікі князь Аляксандр і гарадзенцы ў XV стагоддзі, абіраючы аленя Св. Губерта сімвалам свайго горада, клапаціліся аб захаванні наваколля. Не было чарнобыльскіх зонаў, ні нітратаў у харчах, ні забруджанага паветра. Наша рэчка Гараднічанка, што працякае праз Гродна, і дзе апошняя плотка была вылаўлена трыццаць гадоў таму, была адной з найбольш рыбных на Беларусі: тут нават нераставалі ласосі. Але трэба аддаць належнае нашым прашчурам: ужо ў той далёкі час

яны ясна разумелі, што галоўнае багацце Гродзеншчыны — прырода. Нават крыжакі, ідучы на наш горад, зрэдку пісалі: “Ідзём на Гартэну (Гародню)", часцей за ўсё мы прачытаем у хроніцы: "Ідзём у Пушчу". Менавіта суцэльнай пушчай выдавалася тагачасным людзям Прынямонне: бясконцыя адвечны? лясы, глыбокія азёры, паўцінне рэчак, непраходныя балоты. Тут і ад бываліся вядомыя далёка за межамі Вялікага княства Літоўскага шумныя і багатыя паляванні, а ў Гародні і іншых мястэчках будаваліся палацы і замкі, што ўзбагачала наш горад і рабіла яго летняй рэзідэнцыяй каралёў, князёў і магнатаў.

Быў драўляны палац вялікага князя і ў Берштах на ўскраіне знакамітай тагачаснай Берштаўскай пушчы. У ім на беразе маляўнічага возера адбыўся дзяржаўны сойм 1496 года, а гродзенцы ўмела выкарысталі добразычлівы настрой гаспадара пасля традыцыйна ўдалых паляўнічых забаў, атрымаўшы прывілей. Сведкамі той пары дайшлі да нас назвы навакольных берштаўскіх вёсак: Зубрава, Воўчі Ямы, Зубраўка, Арлова Гара, Засада, Сабакінцы...

Дарэчы, і археалагічныя раскопкі ў Гродна сведчаць, што косткі жывёл складаюць у XIV—XV стагоддзях большую частку, чаго няма ў ніводным іншым горадзе Беласі, Літвы і Польшчы. Таму лёгка зразумець, чаму гарадзенцы, абіраючы сабе ў якасці герба аленя Св. Губерта, сцвярджалі святасць прыроды. І тэта традыцыя бярэ пачатак яшчэ ў дахрысціянскія часы, бо ў хрысціянаў вобраз Хрыста ў выглядзе аленя з'явіўся ад язычніцкага міфалагічнага культу Сонца: алень — Сонца. Крыж у язычнікаў увасабляў Сонца і таму не выпадкова яго з’яўленне ў рагах аленя.

Гістарычны сімвал Гродна герб з аленем Св. Губерта – ўпрыгожваў сцяг горада і пячатку тры стагоддзі: праіснаваў ён да моманту далучэння Беларусі да Расійскай імперыі пасля падзелу Рэчы палітай у канцы XVIII стагодзя. Расія не ведала ў сваім гістарычным дарэвалюцыйным развіцці прынцыпаў еўрапейскай гарадской дэмакратыі, якія ўвасобіла ў Магдэбургскае права, і таму не дзіўна, што гэтае права на самакіраванне гарадоў было адменена ўказаннем Кацярыны II. Той жа маркотны лёс напаткаў і старажытныя гарадскія гербы, што нагадвалі пра самастойнасць і свабодалюбства — іх забаранілі. У XX стагоддзі алень Св. Губерта ў якасці гістарычнага сімвала Гародні двойчы адраджаўся на пачатку 20-х гадоў і ў 1990 годзе.

Сёння мы амаль страцілі разуменне старадаўняй сімволікі. А разам з тым геральдыка — гэта сапраўдная навука, у якой свае законы і правілы.

Кожны элемент гродзенскага герба мае свой сэнс. Алень — прырода, жыццё; крыж — святасць і ягоны залаты колер — багацце, сіла; блакітны колер геральдычнага шчыта — вечнасць і прыгажосць. Нашыя продкі змаглі нават зашыфраваць у гербе назву горада: загародка, над якой ляціць алень, на старабеларускай мове — “гародня", а менавіта так у сярэднявеччы называлі сённяшні Гродна. Адлюстравана тут і радасць вызвалення: алень, пераскокваючы праз "гародню", станавіўся вольным — гэта сімвалізавала свабоду і самастойнасць горада, які атрымліваў Магдэбургскае права.

Але самае дзіўнае і надзвычайнае тое, што ў Гродна захаваўся вежавы гадзіннік, што адмярае ўжо паўтысячагоддзе гарадскі час, і які з’яўляецца разам з гербам сведкам нашай гераічнай і трагічнай гісторыі. Прытым сведкам жывым, дзейнічаючым і з лёсам, які фактычна не мае аналагаў. Справа ў тым, што сярэднявечныя гадзіннікі сёння можна ў Еўропе сустрэць практычна толькі ў музеях, бо старыя механізмы звычайна замяняліся на новыя, больш дасканалыя і сучасныя. Гродзенскі ж вежавы гадзіннік захаваў большасць сваіх першародных дэталяў і сёння знаходзіцца ў Фарным касцёле, што выходзіць сваім фасадам на былую Рыначную плошчу.

З'явіўся ён тут у 1725 годзе, і ўжо ў той час архіўныя дакументы называюць яго старажытным. А зроблены гэты гадзіннік быў яшчэ для гродзенскай ратушы, аб якой гаворыцца ў прывілеі 1496 года. Згодна з гравюрай Г. Адэльгаўзера — М. Цюндта з 1568 года ратуша ўяўляла сабой мураваны двухпавярховы будынак з дзвюма вежамі і галерэяй, які змяшчаўся на цэнтральнай плошчы. Вядома, што ў 1541 годзе каралева Бона Сфорца прадпісала гродзенскаму магістрату ўзяць на службу гадзіннікавага майстра, каб абслугоўваць механізм, які знаходзіўся ў вялікай вежы сатушы. У час адной з найбольш трагічных для Беларусі руска-польскай вайны ратуша была разбурана, але гадзіннік пацярпеў нязначна, і гараджане пачалі збор сродкаў на яго аднаўленне. Да справы далучыліся гродзенскія езуіты, і гадзіннік пасля ремонту змясцілі ў іх калейуме.

Сёння гродзенскі вежавы гадзіннік перажывае сваё другое нараджэнне. У супрацоўніцтве з Эрмітажам вядзецца поўная навуковая рэстаўрацыя механізму. Па старадаўніх тэхналогіях апрацоўкі метала выкоўваюцца элементы, знішчаныя часам. У гадзінніка з'явіўся выдатны апякун — Алесь Налівайка, гадзіннікавы майстар, чалавек, захоплены сваёй працай і апантаны. Неўзабаве адродзіцца і пачне біцца жывое сэрца горада. Пажадаем яму адбіваць у старадаўнія званы новы час адраджэння і вяртання нашай

Бацькаўшчыны ў еўрапейскую цывілізацыю.